УДК 94(474/476)ВКЛ)”1588”

Студ. К. А. Капусціна
Навук. кір. дац. В. А. Кузьміч
(кафедра беларускай філалогіі, БДТУ)

# ГІСТОРЫЯ ЭКАЛАГІЧНАЙ ДУМКІ БЕЛАРУСІ (НА АСНОВЕ СТАТУТА ВКЛ 1588)

Сёння кожнага чалавека турбуюць праблемы экалагічнага становішча планеты. Тое, на якім узроўні навукоўцы разглядаюць наступствы чарнобыльскай трагедыі ці высяканне лясоў у басейне ракі Амазонка, ці масавае выміранне жывёл і раслін, паказвае нам, што праблема згубных вынікаў дзейнасці чалавека надзвычай актуальная. Навукова-прамысловая рэвалюцыя значна павялічыла колькасць ядавітых выкідаў у атмасферу і сусветны акіян, але негатыўны ўплыў чалавецтва на прыроду пачаўся значна раней.

Яшчэ ў далёкае III стагоддзе да нашай эры на востраве Шры-Ланка (што ў Індыйскім акіяне) быў прыняты першы закон аб ахове навакольнага асяроддзя. І тады ж царом Дэванампіяціса быў заснаваны першы ў гісторыі чалавецтва прыродны запаведнік. Гэта яшчэ раз падкрэслівае і даказвае той факт, што ўжо ў тыя старадаўнія часы чалавецтва бачыла, якое велізарнае ўздзеянне яно аказвае на навакольны свет. Пазней сярэдневяковая Еўропа таксама клапацілася пра захаванасць сваіх паляўнічых угоддзяў. Амаль кожны кіраўнік ці феадал вызначаў пэўныя нормы для аховы сваіх зямель і дзічыны, на якую час ад часу арганізоўвалася паляванне. Да Еўропы ў гэтым выпадку адносіцца і наша родная Беларусь, а калі удакладніць, то Вялікае Княства Літоўскае, у склад якога на той час і ўваходзіла наша краіна. На тэрыторыі гэтай магутнай краіны панаваў адзіны звод законаў — Статут Вялікага Княства Літоўскага, які і рэгуляваў паводзіны насельніцтва, у тым ліку і ў дачыненні да прыродных багаццяў.

Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 да нашага часу з’яўляецца прыкладам зводу законаў для ўсіх заканадаўцаў. Ён працаваў нават пасля знікнення краіны з палітычнай арэны свету. Статут ВКЛ быў настолькі лагічны, просты ў сваім выкладзе і зразумелы кожнаму, што расійская ўлада да 1840 года не адмяняла дзеянне статута на ўсёй падуладнай ёй тэрыторыі былога ВКЛ, бо яе сістэма прававых актаў была вельмі далёкай ад узору Статута. Дзясяты раздзел гэтага дакумента быў цалкам прысвечаны ахове прыроднай маёмасці шляхты. Уводзілася адказнасць за захаванне жывёльнага свету, напрыклад за забойства звера ўводзілася грашовае пакаранне:

- за забойства зубра плацілі дванаццаць рублёў грошаў;
- за лася — шэсць рублёў грошаў;
- За аленя або лань — шэсць рублёў грошаў.

(100 грошаў = 1 рубель, а “капа” — чыста лікавая адзінка, якая паказвае колькасць, якая складаецца з 60 адзінак. Таму 1 капа грошаў ёсць 60 грошаў. Паўкапы грошаў = 30 грошаў.)

Трэба адзначыць, што гэта даволі вялікія штрафы, бо цэны на хатнюю жывёлу былі значна ніжэй:

- Вол — 80 грошаў;
- бык — 40 грошаў;
- свіння — 20 грошаў;
- гусь — 3 грошы;
- курыца — 1,5 гроша.

Сярэдні чынш (грашовая рэнта за карыстанне зямлёй) складаў прыблізна 12 грошаў.

Наша Радзіма мае вельмі магутныя карані гісторыі, якія моцна трымаюць яе, уплываючы на ўсе сферы жыцця. Беларускі менталітэт і яго адметныя рысы таксама вынікаюць з гісторыі краіны, яе адносін з суседнімі дзяржавамі і адносінамі ўнутры краіны. Статут ВКЛ адлюстроўвае быт беларусаў таго часу. Калі цана за забітага на паляванні ў чужой пушчы звера ці разбуранае гняздо лебедзя ці сокала, ці зрублены дуб настолькі высокая, то і жаданне зрабіць такое злачынства рэзка змяншаецца. Гэта шэраг законаў, які звязвае не толькі адміністрацыйныя нормы, але і маральныя, якія выхоўвалі ў дзецях нашы продкі. Адсюль і беражлівае стаўленне большасці беларусаў да прыроды і роднага краю. З якой павагай мы ставімся да сімвалаў краіны – бусла і зубра, да хлеба надзённага простага сялянскага чалавека, бульбы, ягад ці палявых кветак. Гэта простыя радасці, але на самай справе яны значна вышэйшыя і бліжэйшыя да сапраўднай прыроды чалавека, яго сутнасці.

Трэба разумець, што ўсведамленне ўласнай экалагічнай традыцыі набывае сёння асаблівае значэнне. Дзяржаўныя і заканадаўчыя ініцыятывы па ахове навакольнага асяроддзя, якія прымаюцца ў апошні час, будуць паспяховымі толькі тады, калі яны будуць ажыццяўляцца на трывалым падмурку экалагічнай культуры. Беларусь як паўнапраўная ўдзельніца агульнаеўрапейскай экалагічнай культуры справядліва асацыіруецца на сусветнай арэне з павагай да прыроды, беражлівым стаўленнем для навакольнага асяроддзя. Экалагічным элементам напоўнена большасць класічных твораў беларускай мастацкай, юрыдычнай і грамадска-палітычнай

літаратуры, пачынаючы ад Францыска Скарыны і юрыдычных помнікаў ВКЛ і да твораў новых беларускіх пісьменнікаў. Еднасць з прыродай і яе абагаўленне – гэта неад’емная частка беларускага менталітэту і іміджу краіны. Развіваючы экалагічны турызм і будуючы эканоміку, заснаваную на сучасных прынцыпах, мы не можам ігнараваць той вялізны набытак, які пакінулі нам нашы продкі, што больш глыбока адчувалі еднасць чалавека з прыродай.

Такім чынам, вывучэнне экалагічнай думкі краіны служыць не толькі маральна-этычным і чыста даследчым мэтам, але і дапамагае ў выхаванні асобы сапраўднага гаспадара і патрыёта сваёй зямлі, адказнага перад дзяржавай, сапраўднага патрыёта, здольнага памножыць той прыродны скарб, які захавалі для яго продкі.

УДК 82-4:908

Студ. А. А. Бутурава
Навук. кір. дац. В. А. Кузьміч
(кафедра беларускай філалогіі, БДТУ)

## СЦЯЖЫНКАМІ РОДНАГА КРАЮ (ГІСТАРЫЧНЫ НАРЫС)

Гарады і вёскі беларускай зямлі… Яны, як і людзі, маюць свой непаўторны твар, свой жыццёвы лёс, свае здабыткі. Адны славяцца старажытным мінулым, выключнай роляй у канкрэтных гістарычных падзеях. Другія – архітэктурнымі помнікамі, прыгажосцю сучасных забудоў. Трэція – дасягненнямі ў эканамічным развіцці, маладосцю.

Любоў да Радзімы пачынаецца з любові да родных мясцін, з імкнення пранікнуць у іх гісторыю.

Сталовіцкая зямля. Пра яе можна расказваць доўга, але абмяжуемся вядомым выказваннем: незвычайнае часта знаходзіцца побач, і гэта побач – вёска Сталовічы.

Вёска Сталовічы знаходзіцца на поўначы Баранавіцкага раёна за 10 кіламетраў ад раённага цэнтра горада Баранавічы

Адкуль жа ўзялася гэта назва Сталовічы?

У “Кароткім тапанімічным слоўніку” Жучкевіча яе паходжанне тлумачыцца наступным чынам. Назва паходзіць ад старажытнарускага тэрміна “стольны” – так называлі часам галоўную сядзібу, ці галоўнае паселішча таго ці іншага князя (ад гэтага ж і слова сталіца). Існуе легенда, якая звязвае ўзнікненне назвы Сталовічы з іменем князя Мікалая Крыштафора Радзівіла Сіроткі. Князь вырашыў паехаць у Рым